# Навіны і новаўвядзенні

Чарговая апаратная нарада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатолія Маркевіча з начальнікамі ўпраўленняў і аддзелаў міністэрства адбылася 26 ліпеня. Дзякуючы сродкам відэасувязі ўдзел у нарадзе прынялі таксама начальнікі ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў.

Абмяркоўвалася пытанне ўкладання дзяржаўных сродкаў у рэстаўрацыйныя майстэрні Нацыянальнага мастацкага музея. Канцэпцыя іх развіцця прадугледжвае прыход новых кліентаў з ліку прыватных структур і фізічных асоб, у тым ліку з-за межаў краіны. Сёння тут працуюць дваццаць сем супрацоўнікаў у сектарах рэстаўрацыі алейнага жывапісу, старажытнабеларускага мастацтва, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і сектары хіміка-біялагічных даследаванняў.

Распрацаваны план мерапрыемстваў па святкаванні 100-годдзя з дня заснавання Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, якое будзе адзначацца 15 верасня. У гэты дзень адбудзецца Міжнародны бібліятэчны кангрэс, свой удзел у якім ужо пацвердзілі прадстаўнікі Азербайджана, Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Расійскай Федэрацыі, Узбекістана і Таджыкістана.

25 ліпеня падпісаны закон, які змяняе і дапаўняе нормы Кодэкса аб культуры, паводле якіх пераразмяркоўваюцца паўнамоцтвы паміж Міністэрствам культуры і мясцовымі органамі ўлады па пытаннях выкарыстання гісторыка-культурных каштоўнасцей рэгіянальнага значэння, спрашчаецца парадак правядзення на іх работ па бягучым рамонце. Таксама ўводзіцца абавязак атрымання пасведчання на права арганізацыі і правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства ўсімі арганізатарамі, акрамя фізічных асоб, якія праводзяць мерапрыемства для ўласных патрэб і без атрымання прыбытку, прадугледжваецца сістэма абавязковага ўключэння Міністэрствам культуры арганізатараў культурна-відовішчных мерапрыемстваў у адпаведны рэестр, правядзенне культурных мерапрыемстваў будзе магчымае толькі ўключанымі ў рэестр арганізатарамі. Усталёўваецца прыярытэтнае права на набыццё культурных каштоўнасцей дзяржаўнымі арганізацыямі культуры ў выпадку прыняцця ўласнікам рашэння аб іх адчужэнні, а экскурсійнае абслугоўванне наведвальнікаў музеяў дазваляецца толькі работнікам гэтых музеяў. У законе змяшчаюцца таксама іншыя нормы, у тым ліку па ўдакладненні асобных аспектаў у сферах бібліятэчнай, музейнай, рамеснай дзейнасці, кінематаграфіі і народнай творчасці.